# ИСТОРИЯ

**НОВІКАЎ С. Я., кандыдат гістарычных навук, дацэнт**



**Рэцэнзент КАВАЛЕНЯ А. А., доктар гістарычных навук, прафесар**

## Ваенна-эканамічныя аспекты гісторыі германскай акупацыі Беларусі (1941—1944 гг.)

У рамках дадзенага артыкула размова пойдзе аб арыгінальным дакуменце, выяўленым у архіве Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене. Дакумент, які на падставе сваёй гістарычнай і навуковай важнасці заслугоўвае асобнага разгляду, паколькі ўтрымлівае матэрыялы аб ваенна-эканамічнай гісторыі Беларусі ці гісторыі эканамічнага рабавання германскімі ваеннай і цывільнай акупацыйнымі адміністрацыямі вытворчага і людскога патэнцыялаў нашай краіны.

У сучаснай нямецкамоўнай гістарыяграфіі гэта крыніца атрымала характарыстыку «ключавога дакумента» па ваенна-эканамічнай гісторыі другой сусветнай вайны на Усходзе [1. С. 6], паколькі ў вайне супраць СССР эканамічныя фактары ўтваралі побач з ваеннымі і палітыка-ідэалагічнымі адну галоўную лінію як па заваёве, так і адначасовым выкарыстанні новай «жыццёвай прасторы". Канкрэтныя дакументальныя матэрыялы, маючыя прамое дачыненне да эканамічнага «выкарыстання» акупаваных савецкіх тэрыторый, у тым ліку і тэрыторыі Беларусі, былі пакладзены ў аснову дакумента, які з часу яго стварэння атрымаў чарговую кодавую назву — «Б л а к і т н а я  п а п к а» [2. Bl. I].

Менавіта пад яе блакітнымі вокладкамі была сабрана і апрацавана вялікая колькасць розных справаздач, дзённікаў, статыстычных даных і г.д., таго што характарызавала дзейнасць гаспадарчых інспекцый, гаспадарчых каманд і розных службаў па выкананні загадаў вышэйшага ваеннага кіраўніцтва трэцяга рэйха, распараджэнняў германскіх дзяржаўных устаноў і дырэктыў эканамічнага штаба Ост па «вядзенні гаспадаркі» на акупаваных усходніх тэрыторыях.

У студзені 1945 г., як лічыць вядомы германскі гісторык — на сённяшні дзень навуковы дырэктар Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме — Рольф-Дзітэр Мюлер, матэрыялы маглі быць «практычна падрыхтаванымі» да выдання [1. С. 15].

Разгром трэцяга рэйха прывёў да страты ці знікнення гэтай дакументальнай крыніцы. Яна заставалася невядомай нават на працягу судовага працэсу Міжнароднага трыбунала у Нюрнбергу над ваеннымі злачынцамі нацысцкай Германіі. У той час як падрабязныя матэрыялы з вялікай колькасцю дадаткаў у выглядзе абагульненых табліц аб выкарыстанні вытворчага і людскога патэнцыялаў акупаваных сававецкіх абласцей, на думку нямецкага гісторыка, маглі стаць для кіраўніцтва СССР абгрунтаванай падставай для вынясення абвінавачанняў супраць Германіі і удакладнення патрабаванняў аб выплаце рэпарацый. Аднак у гэтым не былі зацікаўлены прадстаўнікі заходніх акупацыйных зон. Як лічыць Р.-Д.Мюлер, магчымым месцам знаходжання «зніклых» матэрыялаў была бібліятэка ваеннага кіраўніцтва ЗША. Такая згадка не патрабуе асобных пацверджанняў, паколькі на першым і другім аркушах арыгінальнай крыніцы стаіць штамп аб знаходжанні ў распараджэнні амерыканскага «ваеннага кіраўніцтва» ужо нават збрашураваных на той час у два асобныя тамы і аздобленых звонку чырвонай вокладкаў з чорным пераплётным атачэннем матэрыялаў пад назвай «Kriegswirtschaft im Operationsgebiet des Ostens in den Jahren 1941—1943» [3. Bd. I, II]. Шлях вяртання гэтай арыгінальнай першакрыніцы ў архіўныя фонды Германіі нам невядомы, аднак нельга не заўважыць, што арыгінальныя матэрыялы на сённяшні дзень выяўлены толькі ў архіве Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене, а не ў Федэральным ваенным архіве ў Фрайбургу і не ў Федэральным архіве ў Берліне.

Узнікае лагічнае пытанне, што трэба было ўтойваць ці што засталося па-за ўвагай Міжнароднага трыбунала ў Нюрнбергу, інакш кажучы, што хавалася на 457 аркушах арыгінальнага тэкста і за абагульненымі матэрыяламі 82 дадаткаў (з іх 12 не выяўлена. — **С.Н.**) г.зв. «Блакітнай папкі»? [3]. Як адзначае сучасная германская гістарыяграфія, дадаткі з'яўляюцца самай «каштоўнай часткай» гэтай арыгінальнай нямецкамоўнай крыніцы. Такая выснова зроблена на аснове таго, што ў заключнай частцы сабраны абагульненыя табліцы і статыстычныя даныя, якія з аднаго боку раскрываюць ваенна-эканамічныя аспекты каланіяльнай вайны на ўсёй захопленай тэрыторыі СССР, а з другога — утрымліваюць канкрэтныя матэрыялы аб выніках злачыннага рабавання тэрыторыі акупаванай Беларусі ў 1941—1943 гг. Коратка спынімся толькі на некаторых матэрыялах з гэтай часткі дакументальнай крыніцы.

Яна ўтрымлівае дырэктывы аб вядзенні гаспадаркі, распараджэнні аб дзейнасці розных эканамічных службаў, планавыя і выніковыя лічбы на 1941/42, 1942/43, 1943/44 «гаспадарчыя гады», справаздачы аб аб'ёмах нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, табліцы аб дзеючых прамысловых вытворчасцях і колькасці занятых на іх рабочай сіле, а таксама аб маштабах выкарыстання мясцовай рабочай сілы на прымусовых работах як на акупаванай тэрыторыі, так і ў ваеннай эканоміцы трэцяга рэйха і г.д. Нават агульнае знаёмства з гэтымі матэрыяламі прыводзіць да в ы с н о в ы, што паміж ваенна-эканамічнай палі-

тыкай трэцяга рэйха і масавым знішчэннем мірнага насельніцтва на акупаванай усходняй тэрыторыі існуе самая прамая сувязь.

Зазначым, што вытокі гэтай палітыкі бяруць свой пачатак задоўга да ўсталявання германскага акупацыйнага рэжыма на тэрыторыі Беларусі. Так, 2 мая 1941 г. дзяржаўныя сакратары трэцяга рэйха вызначаюць важнейшыя ваенна-эканамічныя сродкі выканання будучай аперацыі пад кодавай назвай «Барбароса». Пратакол гэтага пасяджэння быў агучаны ў Нюрнбергу і таму вядомы гісторыкам. З яго вынікае, што за 7 тыдняў да 22 чэрвеня 1941 г. вызначаецца галоўная ваенна-эканамічная мэта запланаванай аперацыі — поўнае харчовае забеспячэнне германскага вермахта непасрэдна з захопленай усходняй тэрыторыі. Звернем увагу, што галоўным сродкам для дасягнення пастаўленай мэты быў вызначы голад мірнага насельніцтва, інакш кажучы прадугледжвалася галодная смерць «дзесяткаў» мільёнаў людзей дзеля атрымання прадуктаў харчавання для вайсковых часцей [4. S. 84]. У гэтым жа духу былі вытрыманы і «Агульныя палітыка-эканамічныя дырэктывы», распрацаваныя 23.05.1941 г. групай сельскай гаспадаркі для эканамічнага штаба «Ольдэнбург» (пазней Ост. — **С.Н.**) . Дакумент не абмінае і тэрыторыю Беларусі. У адным з яго варыянтаў мы знаходзім такія радкі: асабліва значэнне для забеспячэння бягучых патрэб вермахта ў харчаванні павінна мець нарыхтоўка мяса з беларускай тэрыторыі [5. Bl. 4]. Беларусь, як вынікае з іншых дакументальных крыніц, разглядалася ў якасці «аграрнага і ляснога рэгіёна» у асноўным для атрымання мяса, коней і аўса [6. S. 140].

«Жыццё» германскага вермахта за кошт ці з тэрыторыі занятай Беларусі — такую злачынную ваенна-эканамічную задачу выконвала нарыхтоўчая каманда, што з лета 1941 г. побач з спецаддзеламі палявых і мясцовых камендатур бязлітасна дзейнічала на тэрыторыі «Нарыхтоўчай акругі «Днепр» з уключэннем у яе склад акупаванай на той час Лагойшчыны, а таксама большай часткі Міншчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны. Напрыклад, у «Erfahrungsbericht Wi Kdo Minsk» ад 28 жніўня 1941 г. паведамляецца: ў рамках заданняў «Нарыхтоўчай акругі «Днепр» каманда пачала запланаванае забеспячэнне вайсковых часцей агульнай колькасцю 1600000 чалавек з улікам такіх дзённых патрэб — у мясе 1200 галоў буйной рагатай жывёлы (плюс 20 %), 7500 ц хлеба (плюс 20%), 24000 ц бульбы, 9600 ц тлушчу, 24000 ц аўсу, 20000 ц сена. Свае разлікі кіраніцтва «Нарыхтоўчай каманды Мінск» рабіла зыходзячы з таго, што на канец жніўня 1941 г. у зоне яе дзейнасці колькасць буйной рагатай жывёлы магла складаць 1240000 галоў, свіней — 1100000, авечак — 1130000, коней — 600000. У дакуменце да таго адзначаецца, што да канца жніўня 1941 г. ўжо наладжаны пастаўкі нарыхтаванай сельскагаспадарчай прадукцыі. З Мінска было адпраўлена: у рэйх — 1500 галоў буйной рагатай жывёлы, 2400 — для вермахта [7. Bl. 3, 3 R].

Разглядаючы асобныя дадаткі да «Блакітнай папкі», якія ўтрымліваць падрабязныя даныя аб выніках дзейнасці эканамічных службаў ваеннай і цывільнай адміністрацый на захопленай тэрыторыі, неабходна заўважыць, што сярод звестак аб выкананні заданняў за 1941/42 і 1942/43 «гаспадарчыя» гады сустракаюцца матэрыялы па генеральнай акрузе Беларусь і гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр». Тэрыторыя Беларусі, якая ўваходзіла ў склад 11 паўночных акруг рэй-

хскамісарыята Украіна, а таксама ў склад акругі Беласток і генеральнай акругі Літва, у дакументальный крыніцы не выдзелена асобным радком, што абцяжарвае даследчыцкі пошук у дачыненні да выяўлення абсалютна дакладных лічбаў. Між тым звернемся да дадаткаў 27 і 28: у першым выпадку аб выкананні нарыхтоўчых заданняў па зерні, мясу і тлушчах на працягу 1941/42 і 1942/43 гаспадарчых годоў, а ў другім — аб пастаўках вермахту і ў рэйх з захопленых усходніх абласцей за перыяд з ліпеня 1941 г. да канца снежня 1943 г. [1. S. 448, 449]. Падлікі, праведзеныя на аснове гэтых дадаткаў, паказваюць, што за два «гаспадарчыя» гады на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь і эканамічнай інспекцыі Цэнтр было нарыхтавана 800000 т зерня, з якога 394000 т — пастаўлена вермахту і адпраўлена ў рэйх. Пры параўнанні выяўленых даных вынікае, што на насельніцтва генеральнай акругі Беларусь выпадала практычна трэць тых заданняў, якія па зерненарыхтоўках былі выкананы на тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі Цэнтр. Нарыхтоўкі мяса складалі адпаведна 185000 т, з якіх 83082 т былі адпраўлены для вермахта і ў рэйх. Як бачна з лічбаў, прыведзеных у дадатках 27 і 28, агульныя зерне- і мясанарыхтоўкі на тэрыторыі Беларусі і тылавой групы армій «Цэнтр» складалі адпаведна толькі восьмую частку ад тых аб'ёмаў зерня і трэць мяса, нарыхтаваных да 31.12.1943 г. з усёй акупаванай усходняй тэрыторыі [1. S. 449].

Аналіз матэрыялаў выяўленай архіўнай крыніцы паказвае, што на тэрыторыі Беларусі, уключанай у зону тылавой групы армій Цэнтр, акрамя гаспадарчай каманды Мінск дзейнічалі гаспадарчыя каманды і іх адзяленні ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Гомелі, Клімавічах, Лепелі, Магілёве, Оршы, Полацку і Чэрвені, а таксама спецыяльныя службы палявых і мясцовых камендатур у Асіповічах, Бешанковічах, Горках і Чэрыкаве [1. S. 430]. Так, дадатак 34 утрымлівае звесткі аб выніках вытворчасці харчовай прадукцыі на перапрацоўчых прадпрыемствах, большасць якіх знаходзіліся на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь і гаспадарчай інспекцыі Цэнтр, дзе ў канцы 1943 г. штодзённа выраблялася 857 тон мукі, выпякалася 342 тоны хлеба, што было на 92 тоны больш, чым гэта мела месца ў пачатку года. Зазначым, што з канца 1943 г. лінія фронта праходзіла ўжо па ўсходняй тэрыторыі Беларусі, у выніку чаго вайсковыя часці гэтай ваеннай групоўкі канцэнтраваліся на тэрыторыі Беларусі. Апрача хлеба, з мясцовых перапрацоўчых прадпрыемстваў германскі вермахт атрымліваў штодзённа 60 тон мясных прадуктаў, 31 тону малака і 3 тоны сыра, 73 тоны садавіны і гародніны [1. S. 459].

Маштабы эканамічнага выкарыстання вытворчага і людскога патэнцыялаў з усходняй акупаванай тэрыторыі найбольш яскрава адлюстраваны ў дадатку 52, у якім больш чым на 10 аркушах прыведзены падрабязныя статыстычныя даныя аб выніках дзейнасці галаўной групы эканомікі «Эканамічнага штаба Ост» за перыяд з чэрвеня 1941 г. да 29 лютага 1944 г. [1. S. 478]. Тут жа згадваюцца дакладныя лічбы аб вывазе у рэйх значнай колькасці захопленай сыравіны і матэрыялаў, а таксама аб іх пастаўках вайсковым часцям вермахта, у распараджэнне міністэрства ўзбраенняў і цывільнага кіраўніцтва. Недахопам разглядаемай табліцы з абагульненымі данымі можна лічыць тое, што ў ёй адсутнічаюць звесткі аб месцы геаграфічнага паходжання выяўленнай, нарыхтаванай і вывезенай

сыравіны і матэрыялаў. У некаторым сэнсе гэты прабел можна ліквідаваць, калі звярнуцца да асобных табліц. Напрыклад, табліца 45 і 46 утрымліваюць звесткі аб выкананні плана на «1942/43 гаспадарчы год» у вобласці пастаўкі сыравіны лясной гаспадаркі непасрэдна ў рэйх [1. S. 472]. У адпаведнасці з разлікамі гаспадарчы год пачынаўся ў кастрычніку, аднак ужо ў жніўні 1942 г. пачалася нарыхтоўка леса і драўніны на паліва на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі Цэнтр. Прыведзеныя колькасныя паказчыкі сведчаць, што цэнтрам леса- і дрэванарыхтоўкі на ўсёй акупаванай тэрыторыі з'яўляліся раёны тылавой групы армій Цэнтр, у тым ліку і Беларусі.

На тэрыторыі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад генеральнай акругі Беларусь і гаспадарчай інспекцыі Цэнтр, апрача таго знаходзілася 800 прадпрыемстваў, на якіх у пачатку 1943 г. на торфанарыхтоўках, на апрацоўцы металаў, выпуску асобных відаў хімічнай, скуранай і тэкстыльнай прадукцыі, на дрэваапрацоўцы, у будаўніцтве і інш. галінах, апрача харчовай, было занята 53899 чалавек [1. S. 477].

З 6 лютага 1943 г. для ўсяго мясцовага насельніцтва ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў, што знаходзілася ў зоне аператыўнай дзейнасці сухапутных войскаў германскага вермахта, уводзілася абавязковая рабочая павіннасць. Пры гэтым устанаўлівалася агульная працягласць рабочага тыдня, які складаў 54 гадзіны; апрача таго кожны заняты на работах абавязаны быў выконваць розныя дадатковыя заданні ў любыя часы сутак і незалежна ад дня нядзелі. Пра гэта ідзе размова ў дадатку 63, у якім змешчана распараджэнне начальніка штаба сухапутных войскаў ад 6.02.1943 г. аб рабочай павіннасці і выкарыстанні рабочай сілы ў зоне аператыўнай дзейнасці германскага вермахта [1. S. 499]. У дадатку 73 наадварот, згадваюцца штомесячныя лічбы ўсіх тых, хто са студзеня 1942 г. да чэрвеня 1944 г. быў адпраўлены на прымусовыя работы ў рэйх. За гэты перыяд з тэрыторыі эканамічных інспекцый «Поўдзень", «Цэнтр» і «Поўнач» быў дэпартаваны 1398531 чалавек, з якіх з тэрыторыі эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» — 307927 ці 22 працэнты ад іх агульнай колькасці [1. S. 549 — 550].

У заключнай частцы дадаткаў змешчаны памяткі і распараджэнні эканамічнага штаба Ост аб задачах, якія павінны стаяць перад эканамічнымі службамі падчас адступлення з захопленай тэрыторыі. Злачынны характар дырэктыўнага дакумента, выдадзенага эканамічным штабам Ост 21.2.1943 г., вынікае з галоўнай мэты — у выпадку адступлення з захопленай тэрыторыі правядзенне мерапрыемстваў па максімальным выкарыстанні наяўнага вытворчага патэнцыялу, а таксама рабочай сілы для германскай ваеннай эканомікі. У першым выпадку «памяткай» эканамічнага штаба Ост прадугледжваліся мерапрыемствы ў вобласці сельскай гаспадаркі, прамысловай вытворчасці, лясной гаспадаркі, а таксама ў дачыненні да рабочай сілы. Напрыклад, асаблівая ўвага сярод сельскагаспадарчай прадукцыі надавалася зерню, фуражу і жывёле. Неадкладнаму вывазу падлягалі машыны і матэрыялы, лес. Надзвычайны інтарэс мелі акупанты і да мясцовых кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў як у галіне прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі. У другім выпадку, калі эканамічныя інспекцыі і гаспадарчыя каманды не маглі забяспечыць свое-

часовы вываз прамысловага абсталявання, сыравіны ці матэрыялаў, яны павінны быць пашкоджаны ці разбураны [1. S. 553—560].

Такім чынам, нават агульнае знаёмства з матэрыяламі «Блакітнай папкі» сведчыць аб неабходнасці яе ўсебаковага вывучэння і на гэтай аснове значнага пашырэння канцэптуальнага гарызонта беларускай гістарычнай навукі аб ваенна-гаспадарчай гісторыі Беларусі 1941—1944 гг.

---


1. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943: der Abschlussbericht des Wirtschaftsstabes Ost und Aufzeichnungen eines Angehoerigen des Wirtschaftskommandos Kiew. Boppard a.R, 1991.

2. Архіў Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене (далей — A IfZ). A IfZ: ED 2/I: Kriegswirtschaft im Operationsgebiet des Ostens in den Jahren 1941—1943.

3. A IfZ, ED 2/I: Kriegswirtschaft im Operationsgebiet des Ostens in den Jahren 1941—1943: Bd. I, Bl. I—XII, 1—195; ED 2/II: Bd. 2, Bl. 196—457.

4. Dok. 2718-PS: Aktennotiz ueber Ergebnis der heutigen Bespaechung mit den Staatssekraeteren ueber Barbaross v. 2.5.41, in: Der Prozess gegen die Hauptkriegsverbrecher vor dem Internationalen Militaergerichtshof, Bd. 31.

5. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей — BA-MA). BA-MA, RW 31/144: Wirtschatspolitische Richtlinien fuer die Wirtschatsorganisation Ost vom 23.5.41, erarbeitet von der Gruppe Landwirtschaft.

6. *Gerlach Ch.* Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

7. BA-MA, RW 30/37: Wi Kdo Minsk. Erfahrungsbericht v. 28.August 1941.